**22.** Якія сказы з прапанаваных правільна пабудаваны?

*1. Ідучы са школы, згубіўся мой каляровы аловак.*
*2. Увайшоўшы ў пакой, дзверы за намі рэзка зачыніліся.*
*3. Выходзячы з кабінета, у вочы кінулася аб'ява.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**23.** Выберыце з дадзеных прыслоўі, якія правільна напісаны:

*1) безаглядкі; 2) без разбору; 3) зразгону; 4) як след.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**24.** Якую назву мае '*тоўсты, шчыльны матэрыял, звалены з шэрсці, воўны*'?

**А)** бязь. **Б)** бавоўна. **В)** паркаль. **Г)** аксаміт. **Д)** лямец.

**25.** У беларускай паэзіі апрача чатырох- і двухрадковых строф, якімі напісана пераважная большасць вершаў, ужываецца і трохрадковая страфа. Якую назву яна яшчэ мае?

**А)** квінціла. **Б)** актэт. **В)** тэрцэт. **Г)** дэцыма. **Д)** нона.

**26.** Выберыце з дадзеных словы, якія пішуцца праз злучок:

*1) (блок)сістэма; 2) (буд)пляцоўка; 3) (бліц)інтэрв'ю.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**27.** Дапоўніце народныя выразы па пачатку:

*а) спачатку падумай – ...; б) рана ўстанеш – ... ; в) умееў памыліцца – ... .*
*1) умей і паправіцца; 2) потым гавары; 3) многа зробіш.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-1, б-3, в-2. **В)** а-2, б-1, в-3. **Г)** а-2, б-3, в-1. **Д)** а-3, б-2, в-1.

**28.** У старажытнай Грэцыі гэту прыгожую кветку вельмі любілі, таму і назву далі рамантычную. У перакладзе на беларускую мову назва абазначае "журавель". У народзе гэту кветку яшчэ называюць журавельнік.
Як называецца расліна?

**А)** лілея. **Б)** герань. **В)** гарлачык. **Г)** касач. **Д)** гладыёлус.

**29.** *Уяўная замкнутая крывая лінія, якая праходзіць праз полюсы зямнога шара і перасякае экватар*, называецца … .

**А)** мерыдыян. **Б)** мерадыян. **В)** мерадыан. **Г)** мерыдыан. **Д)** мерадзіян.

**30.** Хто з вядомых мастакоў слова з'яўляецца аўтарам вершаванага радка:

*Даражыць пявучым гукам кожным,*
*Як зярняткам чыстым на сяўбе.*

**А)** Г. Бураўкін. **Б)** А. Вялюгін. **В)** В. Таўлай. **Г)** П. Броўка. **Д)** М. Танк.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/
ГА «БА «Конкурс». Заказ 16. Тыраж 14300 экз. г. Мінск. 2016 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2016»

*Чацвер, 18 лютага 2016 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Колькі складоў у слове *добраўпарадкаванасць*?

**А)** 5. **Б)** 6. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 9.

**2.** Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае ў сказе слова?

*Як птушка ў гібкіх трасніках, стралою* **думка** *мільганула* (М. Багдановіч).

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** азначэннем. **Г)** дапаўненнем. **Д)** акалічнасцю.

**3.** Падлічыце, колькі слоў у дадзеным сказе.

*Падпрамяняміяркагасонцаажыламаладаяружа.*

**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**4.** Знайдзіце "лішняе" слова ў радзе:

*ружовы, разумны, блакітны, зялёны.*

**А)** няма "лішняга" слова. **Б)** ружовы. **В)** разумны.
**Г)** блакітны. **Д)** зялёны.

**5.** Якія з дадзеных слоў аднакаранёвыя?

*1) чытач – глядач; 2) чытач – чытанне;*
*3) чытач – чысты; 4) чысцюля – чысты.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**6.** Выберыце з дадзеных слова, якое мае будову *"прыстаўка + корань + суфікс + канчатак"*.

*1) падтрымка; 2) кашулька; 3) мядовы.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**7.** Вызначце, якія дзеясловы з дадзеных напісаны правільна:

*1) спадзяваца; 2) усміхнулась; 3) спяшаюцся.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**8.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі П. Броўкі. Колькі [с'] ужыта ў словах?

*Спявае лета над барамі. Гамоніць поле каласамі,*
*Сасонкі струнамі звіняць. Шапоча ў кветках сенажаць.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**9.** Выберыце з дадзеных толькі назоўнікі мужчынскага роду:

*1) пыл; 2) мазоль; 3) боль; 4) калаж.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**10.** У якім(-іх) слове(-ах) з дадзеных на месцы пропуску неабходна напісаць літару **э**: *1) ч..рэшня; 2) р..жым; 3) др..васек.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2. **Д)** 3.

**11.** *Прыслоўе* – гэта часціна мовы, якая … .

*1) змяняецца па родах, ліках, склонах;*
*2) адказвае на пытанні які? якая? якое? якія?*
*3) адказвае на пытанні дзе? куды? адкуль? калі?*
*4) не змяняецца;*
*5) абазначае прымету прадмета;*
*6) абазначае дзеянне.*

**А)** 1, 2. **Б)** 2, 3. **В)** 3, 4. **Г)** 4, 5. **Д)** 5, 6.

**12.** Якія з дадзеных слоў напісаны правільна?

*1) аппетыт; 2) хакей; 3) бассейн; 4) група; 5) суббота.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 4. **Г)** 3, 5. **Д)** 4, 5.

**13.** У якім парадку трэба размясціць сказы, каб атрымаўся тэкст?

*1. Вось ціха закружылася ў паветры белая лёгкая сняжынка і нячутна легла на зямлю.*
*2. Моцна скаваў мароз зямлю, зрабіў яе цвёрдай, як камень.*
*3. За ёй паказалася другая, трэцяя.*
*4. Усё часцей і часцей залёталі гэтыя белыя халодныя матылькі і пасыпаліся на зямлю.*
*5. Хутка пачала бялець зямля.*

**А)** 1, 2, 5, 3, 4. **Б)** 2, 1, 3, 4, 5. **В)** 3, 4, 2, 5, 1. **Г)** 4, 3, 5, 1, 2. **Д)** 5, 1, 4, 2, 3.

**14.** Дадзены прыметнікі:

*1) бура́чны, 2) бурако́вы, 3) бурачко́вы.*

Якія словы супадаюць у значэнні *'падобны па колеру на бурак'*?

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**15.** Адгадайце народную загадку, слова-адгадка якой "схавалася" ў пераблытаных літарах.

*Хутка грызе, дробна жуе, сама не глытае.*

**А)** і, а, л, п. **Б)** у, ы, з, б. **В)** а, я, н, я, с, ч, к, р.
**Г)** р, с, х, а, о. **Д)** а, о, р, п, т.

**16.** У народзе здаўна існуе прыкмета:

*Зашумеў лес у мароз – будзе … .*

**А)** дождж. **Б)** снег. **В)** адліга. **Г)** сонца. **Д)** навальніца.

**17.** Выберыце з прапанаваных толькі назвы садавіны.

*1) капуста, 2) агрэст, 3) кабачок, 4) персік.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**18.** Якой часцінай мовы з'яўляецца выдзеленае ў сказе слова?

*Жыта ў нізіне вымакла зусім, **затое** на ўзвышшы сцяной стаіць.*

**А)** прыназоўнік. **Б)** займеннік. **В)** злучнік. **Г)** прыслоўе. **Д)** часціца.

**19.** Якія дзеясловы прапушчаны ў народных выслоўях?

*1. Дожджык прамочыць, а сонца … .*
*2. Адной рукой вузел … .*
*3. Дзве работы за раз … .*
*4. Хто вясною скача, той увосень … .*

Выберыце правільныя варыянты з прапанаваных.

*а) узросціць; б) не зробіш; в) плача; г) не завяжаш;*
*д) не развяжаш; е) прасушыць; ё) спявае.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-г, 4-ё. **Б)** 1-б, 2-в, 3-д, 4-а. **В)** 1-г, 2-ё, 3-а, 4-б.
**Г)** 1-д, 2-а, 3-е, 4-г. **Д)** 1-е, 2-г, 3-б, 4-в.

**20.** У якім сказе правільна ўжыты дзеяслоў?

*1. Валакно расшчапілася.*
*2. Маланка расшчапіла сасну.*
*3. Расшчапіць пальцы.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**21.** Якое ўстойлівае спалучэнне мае значэнне *'распачаць якую-небудзь справу, лічачы сябе здольным выканаць яе'*?

**А)** за саломінку ўхапіцца. **Б)** зарубіць сабе на носе. **В)** закрануць за жывое.
**Г)** за гуж узяцца. **Д)** заварыць кашу.